ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

# Гомельскі універсітэт

№ 13 (914) | Аўторак, 8 кастрычніка 1996 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць два разы ў месяц | Цана дагаворная

## НА САВЕЦЕ УНІВЕРСІТЭТА

Пачатак першага ў гэтым навучальным годзе пасяджэння Савета універсітэта быў незвычайным. Ва ўрачыстай абстаноўцы цёпла павіншавалі з 75-гадовым юбілеем доктара педагагічных навук, прафесара кафедры педагогікі, Героя Сацыялістычнай Працы М.А. Дзмітрыева. Самыя шчырыя словы ў адрас Міхаіла Афанасьевіча выказаў рэктар член-карэспандэнт АН Беларусі Л.А.Шамяткоў. Ён уручыў юбіляру Ганаровую грамату універсітэта, а старшыня прафкома Г.І.Варатніцкі -- букет руж.

Групе вучоных ГДУ Л.А. Шамяткоў уручыў дыпломы дацэнтаў.

Затым пачалося абмеркаванне пытанняў, вынесеных на парадак дня Савета. Аб некаторых выніках работы універсітэта ў 1995/96 навучальным годзе і задачах на бягучы навучальны год гаварыў у сваім выступленні рэктар Л.А.Шамяткоў. Ён адзначыў, што калектыву ГДУ, як і работнікам усіх галін народнай гаспадаркі не толькі Беларусі, але і іншых краін СНД, давялося працаваць у напружаны пераходны перыяд. Фінансаванне было крайне абмежаваным. Нягледзячы на цяжкасці, былі дасягнуты станоўчыя вынікі па асноўных напрамках дзейнасці. Прамоўца ахарактарызаваў некаторыя важнейшыя дасягненні.

(ЗАКАНЧЭННЕ НА 2-й стар.)

## ІМЯННЫЯ СТЫПЕНДЫЯТЫ

За выдатную вучобу, актыўны ўдзел у навукова-даследчай рабоце і грамадскім жыцці Саветам універсітэта назначаны імянныя стыпендыі на першы семестр 1996-97 навучальнага года:

**ІМЯ СКАРЫНЫ**

**ШПЫРКО** Вользе -- студэнтцы 4-га курса матэматычнага факультэта, **НІКІЦЮКУ** Юрыю -- студэнту 4-га курса фізічнага факультэта;

**ІМЯ К.КРАПІВЫ**

**СІРОТКІНУ** Андрэю -- студэнту 5-га курса спецыяльнасці "Гісторыя".

**ІМЯ Я.КУПАЛЫ**

**КСЯНДЗОВАЙ** Алене -- студэнтцы 4-га курса спецыяльнасці "Беларуская мова і літаратура";

**ІМЯ Я.КАРСКАГА**

**ВОЛКАВАЙ** Святлане -- студэнтцы 4-га курса спецыяльнасці "Руская мова і літаратура";

**ІМЯ М.БАГДАНОВІЧА**

**КУРАШОВАЙ** Тацццяне -- студэнтцы 5-га курса спецыяльнасці "Бухулік, кантроль і аналіз гаспадарчай дзейнасці";

**ІМЯ Я.КОЛАСА**

**ВАЙЦІШКІНУ** Віктару -- студэнту 4-га курса факультэта фізічнай культуры.

**ІМЯ П.БРОЎКІ**

**ШПАКУ** Вячаславу -- студэнту 3-га курса спецыяльнасці "Правазнаўства".

## МАТЭРЫЯЛЬНАЯ ПАДТРЫМКА

Сёлета пачасціліся грашовыя выплаты выкладчыкам і супрацоўнікам універсітэта. Ім рэгулярна выдаюцца аванс, заработная плата, прэміі і дапамогі. Так, толькі ў трэцім квартале бягучага года, з улікам працоўнага ўкладу кожнага работніка, двойчы выплачаны прэміі і адзін раз -- матэрыяльная дапамога на агульную суму звыш 600 мільёнаў рублёў.

## ДА ЎВАГІ СТУДЭНТАЎ!

**Тым, хто не забяспечаны інтэрнатам і пражывае на прыватных кватэрах, неабходна да 20 кастрычніка з'явіцца ў аддзел па выхаваўчай рабоце з моладдзю (галоўны корпус, п. І-16) для афармлення выплаты грашовай кампенсацыі за кватэрную плату.**

## КАМП'ЮТЭРЫЗАЦЫЯ -- ПАТРЭБА ДНЯ

Згодна праграмы міжнароднага супрацоўніцтва "Тэмпус" у наш універсітэт з Францыі дастаўлена значная партыя камп"ютэраў. Яны прызначаны для аснашчэння падраздзяленняў упраўлення ГДУ.

Камп"ютэрная тэхніка, якая значна аблегчыць і паскорыць работу, наблізіць яе да сучасных патрабаванняў, устаноўлена ў вядучых падраздзяленнях галоўнага корпуса, а таксама ў вучэбным корпусе №5.

Але гэта толькі пачатак вялікай работы па стварэнню адзінай камп"ютэрнай сеткі ў нашай навучальнай установе. На працягу бягучага і наступнага навучальных гадоў чакаюцца яшчэ дзве пастаўкі з замежжа новай тэхнікі, якой будуць аснашчаны і ўсе астатнія карпусы універсітэта.

**Т.ДУБЯК.**




**На здымку: дасланыя ў ГДУ камп"ютэры вытворчасці французскай фірмы "Бюль".**

**Фота У.ЧЫСЦІКА.**

## *З УЗНАГАРОДАЙ!*

За шматгадовую плённую навуковую і вучэбную работу па падрыхтоўцы маладых спецыялістаў, актыўны ўдзел у грамадскім жыцці доктар тэхнічных навук ***ПІНЧУК Вячаслаў Рыгоравіч*** з кафедры агульнай фізікі і дацэнт кафедры беларускай літаратуры ***КАВАЛЕНКА Уладзімір Пятровіч*** узнагароджаны Ганаровымі граматамі універсітэта.

# НА САВЕЦЕ УНІВЕРСІТЭТА

(ЗАКАНЧЭННЕ. ПАЧАТАК НА 1-й стар.)

Ён указаў на асаблівую значнасць стварэння Франка-беларускага інстытута кіравання на базе нашага універсітэта. Яму няма аналагаў не толькі ў Беларусі, але і ў іншых краінах СНД.

Гомельскі дзяржуніверсітэт імя Ф.Скарыны ўдзельнічае ў адной з двух міжнародных праграм у рэспубліцы -- "Тэмпус". У сярэдзіне верасня г.г. дэлегацыя ГДУ выязджала ў англійскі горад Бірмінгем, дзе абмеркаваны перспектыўныя планы ажыццяўлення гэтай праграмы па пяці асноўных напрамках на бягучы навучальны год. У яе рамках нашаму універсітэту аказваецца істотная дапамога. У прыватнасці, нядаўна з Францыі да нас паступіла партыя камп'ютэраў. На бягучы навучальны год для выкладчыкаў і супрацоўнікаў ГДУ прадугледжана значная колькасць камандзіровак для стажыровак і вывучэння замежнага вопыту падрыхтоўкі спецыялістаў у вышэйшай школе. А павучыцца нам ёсць чаму. Л.А.Шамяткоў падзяліўся нядаўнімі ўражаннямі ад прыёму і арганізацыі вучэбнага працэсу ў англійскіх ВНУ.

Рэктар паведаміў аб выніках набору студэнтаў на бягучы навучальны год у наш універсітэт. Сёлета ўпершыню каля 5% першакурснікаў, паспяхова здаўшых уступныя экзамены, было прынята на камерцыйнай аснове. Рэкамендуецца гэты паказчык значна павышаць. Між тым, на думку Л.А.Шамяткова, такі падыход да набору студэнтаў не зусім апраўданы. Ён лічыць больш разумным браць плату са студэнтаў у час вучобы за аказваемыя ім усемагчымыя дадатковыя паслугі.

Значнае месца ў сваім выступленні Л.А.Шамяткоў удзяліў сустрэчы Прэзідэнта нашай краіны А.Р.Лукашэнкі з рэктарамі дзяржаўных і недзяржаўных ВНУ Беларусі і першакурснікамі, якая адбылася 2-га верасня ў сценах Белдзяржуніверсітэта. У ёй удзельнічалі ад нашага універсітэта Л.А.Шамяткоў і трое першакурснікаў. Па словах Леаніда Аляксандравіча, не прыгадваецца, каб калі-небудзь кіраўнік дзяржавы наладжваў такую сустрэчу. Сярод нямногіх выступіўшых на ёй быў і Леанід Аляксандравіч, які расказаў на Савеце пра тое, аб чым гаварыў на гэтым форуме кіраўнкоў ВНУ і будучых маладых спецыялістаў. Затым её сканцэнтраваў увагу на асноўных аспектах выступлення на сустрэчы Прэзідэнта. Перш за ўсё, гэта не трэба спасылацца на існуючыя цяжкасці, а кожнаму на сваім месцы працаваць з поўнай аддачай сіл і ведаў, праяўляць высокую дысцыплінаванасць і адказнасць за даручаную справу. Асаблівая ўвага павінна быць звернута на істотнае паляпшэнне выхавання студэнтаў.

У той жа дзень адбылася сустрэча А.Р.Лукашэнкі з рэктарамі дзяржаўных ВНУ. Л.А.Шамяткоў коратка расказаў аб тых праблемах, якія стаяць перад вышэйшай школай краіны, і якія былі прынцыпова абмеркаваны з удзелам Прэзідэнта.

Другім па парадку дня выступіў прарэктар па вучэбна-выхаваўчай рабоце М.М.Воінаў. Ён гаварыў аб выніках міністэрскай праверкі падрыхтоўкі інтэрнатаў ГДУ да пачатку новага навучальнага года. Сур'ёзных недахопаў вядучы спецыяліст Міністэрства адукацыі і навукі не выявіў. Былі зроблены толькі асобныя заўвагі. Аднак гэта не азначае, што можна заспакоіцца. Работа ў інтэрнатах універсітэта патрабуе ў новых умовах істотнай перабудовы і карэннага паляпшэння.

Па інфармацыі М.М.Воінава Савет абмеркаваў і зацвердзіў перспектыўны план выхаваўчай работы ва універсітэце.

Самым бурным на Савеце было абмеркаванне вынікаў праверкі камісіяй Кабінета Міністраў арганізацыі навукова-даследчай і доследна-канструктарскай работы, выканання яе тэматычных планаў. З інфармацыяй выступіў прарэктар па навуковай рабоце А.М.Сердзюкоў. Ён адзначыў, што камісія выявіла як станоўчыя, так і негатыўныя моманты. Апошняе, у асноўным, датычыцца фінансавай дзейнасці і справаздачнасці. Па гэтаму пытанню было больш 10 выступаючых. Выказваліся розныя і супярэчлівыя думкі.

У прынятай пастанове прадугледжана, каб адзначаныя аўтарытэтнай правяраючай камісіяй недахопы ў далейшым не паўтарыліся, а вінаватыя ў допушчаных праліках панеслі адпаведныя спагнанні.

На пасяджэнні Савета зацверджаны план яго работы на бягучы навучальны год, унесены змяненні ў Статут універсітэта. Па інфармацыі прарэктара па АГР У.М.Палевікова даведзена да ведама, як выконваецца рашэнне Савета універсітэта ад 29 лютага 1996 г.

Прынята рашэнне аб адкрыцці на кафедры аздараўленчай, лячэбнай і фізічнай культуры спецыялізацыі "Фізічная рэабілітацыя".

Савет зацвердзіў імянных стыпендыятаў, разгледзеў некаторыя іншыя пытанні універсітэцкага жыцця.

## ЗА ТВОРЧЫ ЎДЗЕЛ

На імя рэктара нашага універсітэта члена-карэспандэнта АН Рэспублікі Беларусь Л.А.Шамяткова дасланы ліст з аддзела адукацыі гарвыканкома, падпісаны яго загадчыкам В.Ф. Барушковым. У ім выказваецца ўдзячнасць доктару філалагічных навук, прафесару кафедры рускага, агульнага і славянскага мовазнаўства Раісе Міхайлаўне Казловай за актыўны і творчы ўдзел у жнівеньскім семінары настаўнікаў рускай мовы і літаратуры па тэме "Асаблівасці работы настаўнікаў-славеснікаў ва ўмовах пераходу агульнаадукацыйных школ на новы змест адукацыі".



*На здымку: дацэнт кафедры оптыкі Г.М.Гадлеўская вядзе заняткі па механіцы ў студэнтаў гр. Ф-12 спецыяльнасці "Фізіка і тэхнічная творчасць".*

Фота У.ЧЫСЦІКА.

**Шмат адкрыццяў у працэсе авалодання абранай спецыяльнасцю чакае першакурснікаў. Яны зробяць іх на лекцыях і ў час практычных заняткаў.**



Нашы юбіляры

# ЗАЎСЁДЫ НА ПЯРЭДНІМ КРАІ



Споўнілася 75 гадоў вядомаму ў нашай рэспубліцы і за яе межамі вучонаму, Герою Сацыялістычнай Працы, доктару педагагічных навук, прафесару М.А.Дзмітрыеву. Свой працоўны шлях ён пачаў у 1936 годзе настаўнікам школы пасёлка Новы Бялёў. У той год Міхаіл Афанасьевіч закончыў сямігодку, якая на тым часе была салідней навучальнай установай, і пачаў вучыць дарослых, працаваць настаўнікам лікбеза ў Навабялёўскай пачатковай школе. Першую педагагічную адукацыю М.А.Дзмітрыеў атрымаў у Рагачоўскім педагагічным тэхнікуме, потым працягваў вучобу ў Рагачоўскім настаўніцкім інстытуце. Перад вайной, будучы студэнтам, у сувязі з недахопам настаўнікаў, ён быў накіраваны ў Літвінавіцкую школу, а вучобу давялося працягваць завочна.

Вялікая Айчынная вайна перарвала мірную працу маладога педагога, настаўніцкае пяро давялося змяніць на вінтоўку байца Кармянскага знішчальнага батальёна. Малады настаўнік стаў членам падполля, а вясной 1943 г. уступіў у рады 10-й Журавіцкай партызанскай брыгады, быў кулямётчыкам, начальнікам асобага аддзела. Свой баявы шлях М.А.Дзмітрыеў апісаў у кнігах "Каля ціхай Серабранкі" і "У імя жыцця". Ратныя подзвігі Міхаіла Афанасьевіча адзначаны ордэнамі і медалямі.

Адразу пасля вызвалення Гомельшчыны ад фашысцкіх захопнікаў М.А.Дзмітрыеў прыняў самы актыўны ўдзел у арганізацыі народнай адукацыі спачатку як упаўнаважаны аблвыканкома, а затым як загадчык Журавіцкага райана, дырэктар школы. Потым пачалася праца ў Карме на пасадзе кіраўніка аддзела народнай адукацыі, дырэктара кармянскай школы, дзе і праявіўся выдатны талент Міхаіла Афанасьевіча. У 50-я гады М.А.Дзмітрыеў быў назначаны дырэктарам школы-інтэрната, якая будавалася ў Карме. Дзеці-сіроты і дзеці, проста абыдзеныя ўвагай грамадства і сям'і, сталі выхаванцамі ўжо вядомага педагога.

Дзякуючы намаганням М.А.Дзмітрыева наладзіліся цесныя творчыя сувязі паміж калектывамі настаўнікаў і вучняў Кармянскай школы-інтэрната і Паўлышскай сярэдняй школы, дырэктарам якой быў В.А.Сухамлінскі. Абмен дэлегацыямі настаўнікаў і вучняў гэтых школ стаў традыцыйным. Прызнанне педагагічнага майстэрства М.А.Дзітрыева выказана ў словах В.А.Сухамлінскага, якія ён пакінуў у кнізе водгукаў школы-інтэрната: "...У вас, дарагія беларускія сябры, мы ўбачылі сапраўднае майстэрства выхавання. Вы глыбока адчуваеце духоўны свет дзіцяці, вашы выдатныя вучні здзівілі нас сваёй работай і чалавечнасцю..."

Практычную работу ў школе М.А.Дзмітрыеў спалучыў з навуковым пошукам, вынікам якога з'явілася паспяховая абарона ў 1968 г. кандыдацкай дысертацыі. Плённай была работа і рэктарам Мазырскага педінстытута. Пад яго кіраўніцтвам гэтая навучальная ўстанова стала кузняй педагагічных кадраў не толькі па традыцыйных спецыяльнасцях, але і па новых (настаўнікі працы і фізікі, майстры сістэмы прафтэхадукацыі і інш.). Многае было зроблена М.А.Дзмітрыевым для ўмацавання матэрыяльнай базы узначальевай ім навучальнай установы.

Вось ужо больш дзесяці гадоў працуе Міхаіл Афанасьевіч на кафедры педагогікі нашага універсітэта. За гэты час ён паспяхова абараніў доктарскую дысертацыю, атрымаў званне прафесара, выбраны сапраўдным членам дзвюх міжнародных акадэмій і таксама членам-карэспандэнтам Беларускай акадэміі адукацыі. Больш 100 навуковых прац, у тым ліку некалькі манаграфій і вучэбных дапаможнікаў, належаць пяру вядомага вучонага.

Калегі па рабоце, з якімі юбіляр заўсёды падтрымлівае добразычлівыя адносіны, сардэчна павіншавалі М.А.Дзмітрыева са знамянальнай датай у яго жыцці, пажадалі яму моцнага здароўя, творчага даўгалецця.

**Ф.КАДОЛ,**
**дацэнт кафедры педагогікі.**

# Аб імянных стыпендыях для студэнтаў

Імянныя стыпендыі -- гэта стыпендыі імя выдатных асветнікаў, відных дзеячоў навукі і культуры, якія назначаюцца студэнтам, дасягнуўшым выдатных вынікаў у вучобе, праявіўшым сябе ў навукова-даследчай рабоце, навукова-тэхнічнай, тэхнічнай або мастацкай творчасці, алімпіядах, конкурсах, у грамадскім жыцці навучальнай установы.

Назвы і колькасць імянных стыпендый зацвярджаюцца Кабінетам Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Размеркаванне імянных стыпендый паміж навучальнымі ўстановамі ажыццяўляецца Міністэрствам адукацыі і навукі сумесна з зацікаўленымі міністэрствамі і іншымі цэнтральнымі органамі кіравання, у падпарадкаванні якіх знаходзяцца навучальныя ўстановы.

Кандыдаты на атрыманне імянных стыпендый вылучаюцца Саветамі факультэтаў і аддзяленняў навучальных устаноў і назначаюцца Саветамі навучальных устаноў у адпаведнасці з колькасцю выдзеленых імянных стыпендый.

Рашэнне Савета навучальнай установы аб назначэнні імянных стыпендый зацвярджаецца загадам па навучальнай установе.

Размеры імянных стыпендый устанаўліваюцца Міністэрствам фінансаў, Міністэрствам працы па ўзгадненню з Міністэрствам адукацыі і навукі.

*Імянныя стыпендыі назначаюцца:*

-- студэнтам дзённай формы навучання вышэйшых навучальных устаноў, якія маюць па выніках чатырох апошніх экзаменацыйных сесій толькі выдатныя адзнакі і праявілі сябе ў навукова-даследчай рабоце, навукова-тэхнічнай творчасці, алімпіядах, конкурсах, у грамадскім жыцці;

імянныя стыпендыі студэнтам назначаюцца з першага чысла месяца, наступнага за месяцам заканчэння экзаменацыйнай сесіі (месяцам падвядзення вынікаў вучэбнага паўгоддзя).

(ЗАКАНЧЭННЕ на 4-стар.)

**Да ўсенароднага рэферэндуму**

# СМЯРОТНАЕ ПАКАРАННЕ -- СУПРАЦЬ ПРАВОЎ ЧАЛАВЕКА

**У лістападзе ў нашай краіне павінен адбыцца рэферэндум, на якім беларускі народ вызначыць свае пазіцыі да вынесеных на яго пытанняў. Адно з іх -- аб смяротным пакаранні: "за" ці "супраць". У плане абмеркавання пастаўленай праблемы змяшчаецца гэты артыкул.**

Няма ніякіх доказаў таго, што прымяненне смяротнага пакарання дапамагае знізіць злачыннасць або зменшыць палітычнае насілле. У адной краіне за другой яна непрапарцыянальна часта выкарыстоўваецца супраць бедных, расавых або этнічных меншынстваў.

Смяротнае пакаранне -- наўмыснае забойства чалавечай істоты дзяржавай. Абдуманае пазбаўленне жыцця з'яўляецца вышэйшай праявай улады дзяржавы над чалавекам. Таму галоўным довадам за адмену смяротнага пакарання з'яўляецца пытанне, ці трэба надзяляць дзяржаву такім правам.

Калі каля паўстагоддзя назад прадстаўнікі ўсіх краін свету сабраліся разам для таго, каб стварыць Арганізацыю Аб'яднаных Нацый, ім не трэба было нагадваць, што можа здарыцца, калі дзяржава вырашыць, што яго ўлада над людзьмі бязмежная. Жудасныя выпадкі дзяржаўнай жорсткасці і тэрору ў 30-х і 40-х гадах яшчэ не сцерліся з памяці людзей, калі ў снежні 1948 года Генеральная Асамблея ААН аднадушна прыняла Усеагульную дэкларацыю правоў чалавека.

Незалежна ад таго, якія доказы прыводзяць урады ў апраўданне смяротнага пакарання і якімі спосабамі яны прыводзяцца ў выкананне, смяротнае пакаранне неадасоблена ад праблемы правоў чалавека. Рух за адмену смяротнага пакарання нельга адасобіць ад руху за правы чалавека.

Артыкул 3-ці Усеагульнай дэкларацыі сцвярджае, што "Кожны чалавек мае права на жыццё". У арт. 5 катэгарычна пацвярджаецца, што ніхто не павінен падвяргацца здзекам або жорсткім, нечалавечым або прыніжаючым яго годнасць пакаранням. Смяротнае пакаранне парушае гэтыя правы. Яно як і катаванне, з'яўляецца апошняй стадыяй фізічнага і псіхалагічнага насілля, якое адбываецца над чалавекам, які ўжо знаходзіцца пад поўным кантролем дзяржаўных улад.

Мноства жанчын і мужчын былі пакараны зыходзячы з тых меркаванняў, што іх смерць утрымае іншых ад злачынстваў, у асаблівасці ад забойства. Тым не менш, даследаванні, праведзеныя ў розных краінах, не змаглі прадставіць пераканаўчых доказаў таму, што смяротнае пакаранне валодае дзіўнай здольнасцю ўтрымліваць іншых ад здзяйснення пэўных злачынстваў.

Смяротнае пакаранне, несумненна, прадухіліць асуджанага ад здзяйснення новых злачынстваў шляхам канчатковага пазбаўлення дзеяздольнасці. Але ніхто не можа з поўнай упэўненасцю сцвярджаць, што ён здзейсніў бы новае злачынства, калі б яго пакінулі ў жывых. Смяротнае пакаранне ў мэтах пазбаўлення дзеяздольнасці таксама не мае сэнсу: як паказвае вопыт краін, якія адмовіліся ад смяротнага пакарання, небяспечных злачынцаў можна надзейна ізаляваць ад грамадства і не прыбягаючы да такіх варварскіх мер.

У дапаўненне да довадаў запалохвання і страты дзеяздольнасці, упэўненасць якіх вельмі падазроная, смяротнае пакаранне часта аргументуецца неабходнасцю кары за асабліва небяспечныя злачынствы. Згодна гэтаму аргументу, пэўныя людзі заслугоўваюць смяротнага пакарання за прычыненае зло: бываюць злачынствы настолькі жудасныя, што адзіным справядлівым пакараннем з'яўляецца пазбаўленне злачынцы жыцця.

У эмацыянальных адносінах гэта пераканаўчы аргумент. Але калі дапусціць, што гэты довад справядлівы, мы будзем вымушаны адмовіцца ад той асновы, на якой трымаюцца правы чалавека. Цэнтральнае месца ў сістэме правоў чалавека займае іх неад'емнасць. Ніхто, нават чалавек, які здзейсніў самыя жудасныя злачынствы, не можа быць іх пазбаўлены. Правы чалавека ў роўнай меры належаць як лепшым, так і горшым прадстаўнікам роду чалавечага. Менавіта таму яны абараняюць усіх нас.

Многія дзяржавы ўсвядомілі, што смяротнае пакаранне несумяшчальнае з павагай да правоў чалавека. Арганізацыя Аб'яднаных Нацый таксама выказалася за яго адмену. У цяперашні час звыш 40% усіх краін свету адмянілі смяротнае пакаранне па закону або на практыцы. У каля 100 краінах смяротнае пакаранне захоўваецца і прымяняецца.

Кожнае грамадства і кожны чалавек могуць выбіраць, у якім свеце яны жадаюць жыць і які свет яны імкнуцца стварыць для сябе; свет, у якім дзяржава мае права забіваць у якасці законнага пакарання, або свет, заснаваны на павазе да чалавечага жыцця і правоў чалавека, -- свет без смяротнага пакарання.

**По матэрыялах Міжнароднай Амністыі падрыхтаваў В.БОРТНІК, слухач спецыялізацыі "Практычная псіхалогія", выпускнік філалагічнага факультэта ГДУ імя Ф.Скарыны.**

# Аб імянных стыпендыях для студэнтаў

**(ЗАКАНЧЭННЕ. ПАЧАТАК НА 3-стар.)**

За студэнтамі, якія атрымліваюць імянныя стыпендыі, захоўваецца права на атрыманне надбавак, прадугледжаных п.6 пастановы Міністэрства працы і Міністэрства фінансаў Рэспублікі Беларусь ад 29.12.95 г. N104 "Аб памерах дзяржаўных стыпендый навучэнцкай моладзі".

Савет навучальнай установы мае права пазбавіць студэнта імяннной стыпендыі ў выпадку грубага парушэння ім вучэбнай дысцыпліны (пропускаў вучэбных заняткаў без уважлівых прычын, парушэння правілаў унутранага распарадку і г.д.).

Дадзенае палажэнне абавязковае для выканання ў дзяржаўных вышэйшых навучальных установах Рэспублікі Беларусь у адносінах студэнтаў, якія навучаюцца за кошт сродкаў дзяржаўнага бюджэту.

Студэнтам, якія атрымліваюць імянную стыпендыю і пацвердзілі права на яе атрыманне па выніках чарговай экзаменацыйнай сесіі, прадаўжаецца выплата імяннной стыпендыі.

Кіраўнікі навучальных устаноў абавязаны інфармаваць органы кіравання, у падпарадкаванні якіх яны знаходзяцца, і Міністэрства адукацыі і навукі аб фактах пазбаўлення імянных стыпендый і страты студэнтамі права на іх атрыманне, спыненя выплаты стыпендый у сувязі з заканчэннем вучобы, пераводам у іншыя навучальныя ўстановы або адлічэннем па іншых прычынах.

Міністэрства адукацыі і навукі сумесна з міністэрствамі і іншымі цэнтральнымі органамі кіравання, у падпарадкаванні якіх знаходзяцца навучальныя ўстановы, праводзяць пераразмеркаванне стыпендый.

* * *

**Міністэрствам адукацыі і навукі для студэнтаў нашага універсітэта ўстаноўлены наступныя імянныя стыпендыі: дзве -- імя Ф.Скарыны, па адной -- імя Я.Купалы, Я.Багдановіча, Я.Карскага, П.Броўкі, К.Крапівы.**



# ПРАДУМОВЫ БЕРАСЦЕЙСКАЙ УНІІ

***Пытанне аб прадумовах Берасцейскай уніі з'яўляецца зараз надзвычай актуальным для нашай грамадскай думкі і шырока абмяркоўваецца не толькі ў навуковай літаратуры, але і ў прэсе. У бліжэйшы час колькасць публікацый на гэтую тэму рэзка ўзрасце ў сувязі са святкаваннем 400-годдзя уніі, якая была заключана 8 кастрычніка 1596 года. Пры абмеркаванні прадумоў і характару гэтай падзеі выказваюцца самыя розныя, часам падкрэслена супрацьлеглыя, пункты погляду, абумоўленыя ў большасці выпадкаў палітычнымі альбо рэлігійнымі схільнасцямі іх аўтараў.***

На мой погляд, прадумовы Берасцейскай уніі можна падзяліць на некалькі груп. Першая з іх тычыцца самога характару хрысціянства, якое ўзнікла менавіта як сусветная рэлігія. Згодна з ягоным веравучэннем, асноўная мэта прыходу Хрыста -- выратаванне ўсіх людзей шляхам прынясення сябе ў ахвяру за іх грахі. Хрысціянства падкрэслівае, што для выратавання не мае ніякага значэння сацыяльнае становішча чалавека, ягоная нацыянальнасць альбо яшчэ якія-небудзь знешнія прыкметы, бо перад Богам усе роўныя. Кожны, хто прыме вучэнне Хрыста і будзе выконваць ягоныя запаведзі, выратуецца. Такім чынам, спачатку існавала адзіная хрысціянская царква, якая не падзялялася ні на якія адасобленыя часткі.

Першыя прапаведнікі хрысці-янства пераходзілі з аднаго горада Рымскай імперыі ў другі і стваралі хрысціянскія абшчыны. Па меры пашырэння іх колькасці і ўзбуйнення ўзнікла патрэба ў іерархіі -- сукупнасці царкоўных пасад і ўстанаўлення ўзаема-адносін паміж імі. Сярод веруючых вылучыліся дыяканы (служкі), епіскапы (наглядчыкі), прэсвітэры (старэйшыны). Пачынаючы з II стагоддзя, галоўная роля ў жыцці хрысціянскіх абшчын належыць епіскапам. Яны выступаюць як асноўныя спецыялісты ў пытаннях дагматыкі і культу. Епіскапы розных месцаў падтрымлівалі паміж сабой сувязі, што было важным фактарам аб'яднання і ўзмацнення хрысціянства.

Кіраўніком хрысціянскай царквы лічыўся епіскап Рыма. Можна назваць дзве асноўныя прычыны гэтага. Па-першае, Рым быў у той час сталіцай імперыі, і, адпаведна, рымскі епіскап разглядаўся як галоўны сярод іншых. Па-другое, і менавіта гэта для хрысціян было галоўным, існавала багаслоўскае абгрунтаванне такога становішча: першым епіскапам Рыма з'яўляўся апостал Пётр, той самы, якога Хрыстос, згодна з Новым Запаветам, назначыў сваім намеснікам на зямлі. Таму рымскія епіскапы ўспрымаліся хрысціянамі як пераемнікі Пятра, якія захоўваюць і працягваюць апостальскую традыцыю. У V стагоддзі епіскапы Рыма сталі называцца папамі -- айцамі ўсіх хрысціян. Папамі сталі называцца ў гэты ж час таксама епіскапы Александрыі, а епіскапы Іерусаліма, Канстанцінопаля і Анціёхіі -- патрыярхамі, што таксама значыць айцы.

Падставы для непаразуменняў паміж вышэйшымі хрысціянскімі іерархамі ўзніклі па знешніх для царквы прычынах. У 330 годзе сталіца імперыі была перанесена з Рыма ў Канстанцінопаль, а ў 395 г. Рымская імперыя падзялі-лася на дзве часткі -- Усходнюю і Заходнюю. Гэта садзейнічала некатораму ўзвышэнню канстанцінопальскага патрыярха сярод іншых епіскапаў Усходу, але рэальная царкоўная ўлада паранейшаму належыла рымскаму папе, які ў пэўным сэнсе заставаўся кіраўніком усёй царквы, і вяршынства якога прызнавалася большасцю хрысціян. Епіскапа сталіцы імперыі, канстанціно-пальскага патрыярха, такое становішча не задавальняла. Таму паміж ім і рымскім папай паступова наспяваў канфлікт. Знешнімі повадамі для апошняга паслужылі дзве акалічнасці. Па-першае, гэта чыста тэрытарыяльныя спрэчкі за ўладу над царквамі Грэцыі і Паўднёвай Італіі. Існавалі некаторыя разыходжанні ў абрадах Заходняй і Усходняй царквы, і высвятлялася, якога ўзору будуць прытрымлівацца цэрквы на спрэчных тэрыторыях. Была і другая, дагматычная, акалічнасць. Заходняя царква ў пачатку XI стагоддзя прыняла палажэнне аб сыходжанні Святога Духу не толькі ад Бога Айца, але і ад Бога Сына (так званае filiogue (лац.) -- "І ад Сына"). Усходняя царква аб'явіла гэтае дабаўленне адступленнем ад хрысціянскага веравучэння. У выніку павялічваючыхся супярэчнасцяў адбыўся раскол царквы. У 1054 годзе рымскі папа і канстанцінопальскі патрыярх узаемна праклялі адзін аднога.

З гэтага часу адзіная хрысціянская царква падзялілася на дзве вялікія часткі: усходнюю, праваслаўную (правільную) і заходнюю, каталіцкую (слова "каталіцкі" ў перакладзе з лацінскай мовы значыць "сусветны"). Праваслаўную царкву яшчэ называюць грэкакафалічнай ("кафалічны" у перакладзе з грэчаскай мовы таксама значыць "сусветны"). Трэба адзначыць, што адказнасць за раскол царквы нясе як заходні, так і ўсходні бок. Раздзяленне адбылося па малаістотных прычынах, але мела вельмі негатыўныя вынікі для еўрапейскай гісторыі. Бо ва ўмовах, калі рэлігія была галоўнай духоўнай сілай грамадства, яно прывяло да расколу Еўропы на два варожыя лагеры.

Такое становішча ва ўсе часы ўспрымалася як ненармальнае. Таму рабіліся неаднаразовыя спробы аднаўлення былога адзінства хрысціянства, уз'яднання праваслаўнай і каталіцкай царквы, гэтае аб'яднанне, да якога імкнуліся, атрымала назву уніі (ад лацінскага unio -- аб'яднанне, саюз). Ініцыятыва да яе сыходзіла ў асноўным з боку каталіцкай царквы. Рымскія папы, як ужо гаварылася, лічыліся пераемнікамі апостала Пятра, носьбітамі апостальскай традыцыі, намеснікамі Хрыста на зямлі, якія не толькі павінны кіраваць усімі хрысціянамі, але і нясуць за іх адказнасць перад Богам. Каталіцкая царква была значна мацнейшая за праваслаўную, і ўз'яднанне, натуральна, вяло да падпарадкавання праваслаўных рымскаму папе. Праваслаўныя ж іерархі, адпаведна, не згаджаліся на унію, таму што не хацелі страчваць самастойнасць і падпарад-коўвацца Рыму. Апроч таго, праваслаўныя лічылі, што ката-лікі адступілі ад веравучэння хрысціянства, таму што ўнеслі ў яго новыя дагматы. У XIV стагоддзі акрамя палажэння аб сыходжанні Святога Духа не толькі ад Айца, але і ад Сына каталіцкая царква прыняла таксама палажэнне аб чысцілішчы -- месцы, дзе душы людзей ачышчаюцца ад грахоў перад тым, як папасці ў рай (зразумела, апроч тых, каму былі дараваныя грахі ў зямным жыцці, і якія адразу ж пайшлі ў рай, і тых, хто ідзе ў пекла). Праваслаўныя сцвярджалі, што рашэннем Эфескага сабора (431 г.) забаронена дабаўляць новыя дагматы ў Склад веры. Каталікі ж адказвалі, што яны не ўводзяць новыя дагматы, а раскрываюць сэнс старых, і ў сваю чаргу абвінавачвалі праваслаўных у адпадзенні ад апостальскай традыцыі, якая ідзе праз рымскіх пап.

У такіх абставінах магчымасці царкоўнай уніі былі вельмі слабыя. Яны абумоўліваліся перш за ўсё тым, што Візантыя, якая ўзнікла на месцы Усходняй Рымскай імперыі і была цэнтрам праваслаўя, шукала падтрымкі ў краін Заходняй Еўропы ў барацьбе са знешнімі ворагамі. А для гэтага трэба было прызнаць царкоўную ўладу рымскага папы. Таму імкненне да уніі з боку праваслаўных ішло ад візантыйскіх імператараў, якія праследавалі свае палітычныя мэты. Царкоўныя ж праваслаўныя іерархі гэтаму ўсімі сіламі супраціўляліся. Таму першыя спробы уніі поспеху не мелі, бо яны былі чыста вонкавай, чужой з'явай для духоўнага жыцця тых краін, дзе іх спрабавалі ўвесці.

Заключаная ж у 1596 годзе Берасцейская унія, і гэта прызнаюць як яе прыхільнікі, так і праціўнікі, з'яўляецца арганічным вынікам папярэдняга гістарычнага і культурнага развіцця беларускага народа. Сам той факт, што уніяцтва на нашых землях праіснавала амаль два с паловай стагоддзі, ахапіла прыкладна 80% насельніцтва, і расійскім уладам спатрэбіўся даволі вялікі час і намаганні, каб яе канчаткова знішчыць, гаворыць, што Берасцейская унія не была для нашай культуры выпадковай з'явай.

**В.АДЗІНОЧАНКА,**
**дацэнт кафедры беларускай культуры.**

*Да 480-годдзя ўсходнеславянскага кнігадрукавання*

# МУЗЕЮ-ЛАБАРАТОРЫІ Ф.СКАРЫНЫ -- ДЗЯРЖАЎНЫ СТАТУС



Набліжаецца вялікая вяха -- 480 гадоў з дня выхаду першай кнігі Ф. Скарыны, надрукаванай кірылічным шрыфтам і максімальна набліжанай да мовы аднаго з усходнеславянскіх народаў -- беларускага. Да гэтай падзеі засталося менш аднаго года. 6 жніўня 1997 года інтэлігенцыя і ўвесь беларускі народ будзе адзначаць гэтую дату.

Свята вельмі важнае. Яго патрэбна адзначыць на дзяржаўным узроўні і падрыхтавацца вельмі сур'ёзна. На нашу думку, немалаважным мерапрыемствам і пунктам падрыхтоўкі святкавання можна зрабіць музей-лабараторыю Ф.Скарыны нашага універсітэта.

У цяперашні час музей-лабараторыю абслугоўваюць тры штатныя работнікі -- загадчык, спецыяліст I-й катэгорыі і лабарант I-й катэгорыі з вышэйшай адукацыяй. Непасрэднае адміністрацыйнае кіраўніцтва калектывам ажыццяўляе прарэктар па вучэбнай і выхаваўчай рабоце, кандыдат філалагічных навук, дацэнт М.М.Воінаў. Калектыў цесна супрацоўнічае з лексікаграфічнай лабараторыяй, якую ўзначальвае прафесар кафедры беларускай мовы, адзін з самых вядомых скарыназнаўцаў, доктар філалагічных навук У.В.Анічэнка. Уладзімір Васільевіч аказвае нам істотную практычную і навуковую дапамогу. У склад музея-лабараторыі ўваходзяць на грамадскіх пачатках студэнты I-V курсаў філалагічнага факультэта.

Мы займаем невялікія памяшканні. У самым большым разгорнута экспазіцыя "Ф.Скарына ў мастацтве і літаратуры". Гэта адзіная музейная экспазіцыя, але і тая не адпавядае асноўнай сутнасці музея Ф.Скарыны ці не поўнасцю адлюстроўвае яго жыццёвы і творчы шлях.

Музей-лабараторыя Ф.Скарыны існуе з 15 мая 1993 г. За гэты час супрацоўнікамі праведзена 210 індывідуальных і калектыўных экскурсій, у якіх прыняло ўдзел 2870 студэнтаў, навучэнцаў, школьнікаў, вучоных, дзеячоў культуры і іншых наведвальнікаў з Беларусі, Расіі, Украіны, ЗША, Англіі, Германіі, Польшчы, Францыі, Італіі і Кітая. Мы сабралі каля 400 экспанатаў -- кніг, артыкулаў, карцін, скульптур, значкоў, марак, мікрафільмаў, ксеракопій і інш. Усё гэта складае менш чым 10% таго, што створана ва ўсім свеце пра нашага Ф.Скарыну. У памяшканні музея-лабараторыі праводзяцца практычныя і семінарскія заняткі па беларускай мове, літаратуры і гісторыі.

Супрацоўнікамі ўкладзены і здадзены ў друк два зборнікі: "Летапіс пашаны і ўдзячнасці. Паэтычная Скарыніяна", "Сэрцам роднага слова краніся" (паэзія пра беларускую мову. На гэтую ж тэму ў 1990 г. намі быў выпушчаны зборнік "Каласы роднай мовы"). Падрыхтавана картатэка бібліяграфіі, твораў жывапісу, графікі, скульптуры, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, прозвішчаў усіх, хто меў хоць нейкое дачыненне да Ф.Скарыны. Калі ў нашым музеі-лабараторыі будуць сабраны ў арыгіналах і копіях усе творы пра асветніка-гуманіста, будзе падрыхтаваны да друку комплексны сістэматызаваны каталог "Скарыніяна".

Калектыў музея-лабараторыі працуе па двух важнейшых напрамках: праводзіць экскурсіі і прапагандуе творчую спадчыну Скарыны; збірае, вывучае і сістэматызуе матэрыялы пра яго. Асобным напрамкам нашай дзейнасці з'яўляецца збор і сістэматызацыя матэрыялаў па гісторыі універсітэта, які ў 1997 г. будзе адзначаць 65-годдзе ўтварэння Гомельскага педагагічнага інстытута, пераемнікам якога стаў ГДУ.

Упершыню за ўсю гісторыю Скарыніяны пачаты пераклад кніг Ф.Скарыны на іншую мову -- на сучасную беларускую. Мы лічым, што калі ў недалёкім будучым пераклад усіх кніг будзе закончаны і апублікаваны, дык у вывучэнні і засваенні духоўнай спадчыны Ф.Скарыны пачнецца якасна новы этап. У сувязі з графічнымі, лексічнымі і семантычнымі адрозненнямі скарынінскай мовы ад сучаснай беларускай яго творы чытаюць і вывучаюць толькі спецыялісты і аматары, а пераклады знойдуць дарогу да непараўнальна большай колькасці беларускага народа.

Завяршаецца пераклад прадмоў і пасляслоўяў Ф.Скарыны (206 старонак факсімільнага выдання ў энцыклапедычным даведніку "Францыск Скарына і яго час", перакладчыкі М.М.Воінаў і аўтар дадзеных радкоў), "Кнігі суддзяў" (94 с. факсімільнага выдання "Бібліі" Ф.Скарыны, том 2, перакладчыкі -- аўтар дадзеных радкоў і В.І.Яцухна), пачаты пераклад кнігі "Быццё" (186 с.факсімільнага выдання "Бібліі" Ф.Скарыны, том I, перакладчыкі -- аўтар дадзеных радкоў і С.М.Табуліна).

М.М.Воінаў і аўтар дадзеных радкоў з дапамогай студэнтаў III курса філалагічнага факультэта -- грамадскіх супрацоўнікаў музея-лабараторыі Т.Батуравай, С.Прыходзька і І.Усавай працуюць над падрыхтоўкай "Руска-беларускага эканамічнага слоўніка". У сувязі з мяркуемым забеспячэннем музея-лабараторыі персанальным камп'ютэрам праца над гэтым слоўнікам вельмі паскорыцца і будзе відаць ужо яе фініш.

Акрамя станоўчых момантаў, у нашай працы маюцца і значныя цяжкасці. Дзеючая цяпер экспазіцыя была адкрыта 3 гады і 4 месяцы назад. Гэта значыць, што яе трэба абнаўляць. Больш таго, калі існуе музей-лабараторыя Ф.Скарыны, дык абавязкова павінна быць і сапраўдная музейная экспазіцыя, якая б нагляднымі сродкамі, матэрыяльнымі экспанатамі расказвала пра жыццёвы і творчы шлях Ф.Скарыны, мела б дзеючы макет яго друкарні, тэхнічныя сродкі (камп'ютэр, ксеракс і інш.) для дэманстрацыі матэрыялаў з жыцця і дзейнасці першадрукара. Патрэбны сродкі на камандзіроўкі па месцах жыцця Ф.Скарыны, у музеі і архівы, на шматлікія мерапрыемствы, прысвечаныя Скарыну, навуковыя і метадычныя канферэнцыі, на выпіску і пакупку сродкаў масавай інфармацыі і навуковай літаратуры, на асабістую арганізацыю і правядзенне ўласных мерапрыемстваў, на аплату заказаў па вырабу экспанатаў (макетаў, муляжоў і г.д.), на арганізацыю беларускага скарынаўскага пленэра.

Самы танны спосаб змены экспазіцыі -- заключэнне дагавора з уладальнікамі кніг Ф.Скарыны, карцін, скульптур, бібліяграфічных рэдкасцей. Але для гэтага патрэбны не толькі сродкі, але і абсталяванне надзейнай аховы і сігналізацыі, што зноў (у сваю чаргу) упіраецца ў фінансавыя сродкі.

Калі б у нас былі сапраўдная музейная экспазіцыя, тэхнічныя і фінансавыя сродкі (камп'ютэр, ксеракс), мы маглі б увесці платнае наведванне, выдаваць і распаўсюджваць вынікі нашых навуковых даследаванняў, распрацоўваць эскізы ўласнай нагляднай друкаванай прадукцыі.

Але нельга не зазначыць, што цяжкасці і праблемы былі б значна большыя, калі б кіраўніцтва універсітэта, асабліва яго рэктар Л.А.Шамяткоў, не падтрымлівалі калектыў музея-лабараторыі і не жадалі яму выканаць свае абавязкі ў поўным аб'ёме. Гэта, бадай, самы рашаючы фактар нашай у цэлым паспяховай працы.

Вельмі станоўча адбілася б на выніках нашай працы вызначэнне статусу музея-лабараторыі, таму што рана ці позна, хоць і вельмі пастулова, ён ператворыцца ў сусветны цэнтр скарыназнаўства. А стварэння такога цэнтра Скарына больш чым заслугоўвае, і народу нашаму гэта пад сілу. Найлепшы спосаб дабіцца гэтага -- надаць музею-лабараторыі Ф.Скарыны статус дзяржаўнага, пакінуўшы яго ў складзе ГДУ імя Ф.Скарыны. Ёсць жа дзяржаўныя музеі М.Багдановіча, А.Міцкевіча, Я.Коласа, Я.Купалы і г.д. А Ф.Скарына зрабіў уплыў на развіццё беларускага народа не меншы, чым усе гэтыя пісьменнікі.

Каб хоць крыху палепшыць збор матэрыялаў пра Ф.Скарыну, мы звяртаемся да навуковай, культурнай грамадскасці нашай і замежных краін з просьбай -- дасылайце, калі ласка, нам звесткі пра ўсе мерапрыемствы, якія прама ці нават ускосна датычаць Ф.Скарыны, а яшчэ лепш -- накіроўвайце нам запрашэнні для ўдзелу ў гэтых мерапрыемствах на адрас:

**Рэспубліка Беларусь, 246699, г.Гомель, Савецкая, 104, універсітэт, музей-лабараторыя.**

Узняць музей-лабараторыю Ф.Скарыны на належную вышыню, дабіцца ад яе яшчэ лепшай работы можна толькі стварыўшы для яе працы адпаведныя ўмовы ў сэнсе матэрыяльна-тэхнічнай базы і фінансавання. Калі б удалося дабіцца гэтага задоўга да 6 жніўня 1997 г., то было б выдатным падарункам 480-годдзю ўсходнеславянскага і беларускага кнігадрукавання, што дазволіла б па-сапраўднаму падрыхтавацца да свята і прыняць у ім вельмі актыўны ўдзел. Бо, як справядліва пісаў Рыгор Барадулін,

*Мы, беларусы,*
*Раз*
*І назаўсёды павінны*
*Помніць --*
*Да дамавіны:*
*Час нараджэння нас --*
*Час нараджэння Скарыны.*

**К.УСОВІЧ,**
**заг. музея-лабараторыі Ф.Скарыны.**



*Спонсар конкурсу -- прафком студэнтаў ГДУ імя Ф.Скарыны*

**Агульнауніверсітэцкі конкурс "Ану, першакурснік!" 1996 г. праводзіцца 27 кастрычніка з 15.00 у актавай зале ГДУ. Білеты на мерапрыемства будуць распаўсюджвацца праз культурны цэнтр ГДУ і культоргаў на факультэтах.**

## ПАЛАЖЭННЕ
## аб правядзенні агульнауніверсітэцкага конкурсу "Ану, першакурснік!" 1996-97 навучальнага года.



*Гэты прыз атрымае факультэт, які выйдзе пераможцам конкурсу.*

Кожны год ва універсітэце праводзіцца конкурс мастацкай самадзейнасці з мэтай развіцця творчай ініцыятывы, культурнага і эстэтычнага выхавання студэнтаў. Адным з этапаў гэтага конкурсу сярод студэнтаў 1-га курса з"яўляецца "Ану, першакурснік!"

У конкурсе прымаюць удзел толькі студэнты 1-га курса. Дапускаецца акампанемент з боку, а таксама ўдзел не першакурснікаў у парных выступленнях для цэласнасці і мастацкага ўзроўню нумара. Забараняецца і караецца вылічэннем балаў удзел студэнтаў старэйшых курсаў (падлеўка, імітацыя голасам, акцёрская гульня другога плана).

Працягласць выступлення кожнай групы -- не больш 40 мінут (з іх 5 мінут -- кантрольных).

Час на падрыхтоўку перад выступленнем -- 5 мінут.

Конкурсныя праграмы павінны быць прадстаўлены для паказу 23 і 24 кастрычніка і 25 кастрычніка зацверджаны для ўдзелу ў конкурсе.

Да 25 кастрычніка павінны быць прадстаўлены аддрукаваныя праграмы ў колькасці 10 экземпляраў.

У гэтым годзе калектывы рыхтуюць свае праграмы па абавязковай тэматыцы "Восьмы цуд свету". Непасрэдна выбар жанру, у якім рыхтуецца праграма, самастойны. Праграма павінна быць змястоўнай, цікавай і разгорнутай па тэматыцы.

Праграма ацэньваецца па 15-бальнай сістэме.

Парадак выступленняў вызначаны па зваротнаму парадку занятых месцаў групамі першакурснікаў мінулага года, гэта значыць у ніжэйпералічаным парадку:

1. Матэматычны ф-т; 2. Фізічны ф-т; 3. Ф-т фізічнай культуры; 4. Філалагічны ф-т; 15-ці хвілінны перапынак; 5. Геолага-геаграфічны ф-т; 6. Гісторыка-юрыдычны ф-т; 7. Эканамічны ф-т; 8. Біялагічны ф-т.

Журы адзначыць лепшую аўтарскую работу, лепшых вядучых, выканаўчае майстэрства.

Вынікі конкурсу і ўзнагароджанне прызамі з уручэннем пераходнага прыза адбудзецца пасля заканчэння конкурсу ў той жа вечар.

Праграмы ацэньваюцца журы ў складзе:

-- **ЛЫСЯНКОЎ А.В.** -- дырэктар культурнага цэнтра ГДУ.

-- **ШЫРЫНКІНА М.Б** . -- мастацкі кіраўнік.

-- **КАЗЛОЎ М.А.** -- кіраўнік народнай харавой капэлы "Дзянніца".

-- **ВАРОНІН Г.І.** -- кіраўнік беларускага тэатра "Калі б..."

-- **ЭБЗЕЕВА А.М.** -- кіраўнік фальклорнага калектыву.

-- Прадстаўнік рэктарата.

-- Прадстаўнік прафкома.

Палажэнне аб конкурсе прынята мастацкім саветам культурнага цэнтра ГДУ імя Ф.Скарыны 7 кастрычніка г.г.

**ГОМЕЛЬСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ імя Ф.СКАРЫНЫ**

аб'яўляе конкурс на замяшчэнне вакантных пасад па кафедрах:

-- тэарэтычнай фізікі -- ст. выкладчыка;

-- геаграфіі -- загадчыка; асістэнта;

-- рускага, агульнага і славянскага мовазнаўства -- асістэнта;

-- дыферэнцыяльных ураўненняў -- асістэнта;

-- геалогіі і разведкі карысных выкапняў -- асістэнта;

-- геаэкалогіі -- загадчыка;

-- хіміі -- дацэнта;

-- эканомікі і кіравання вытворчасцю -- загадчыка.

Тэрмін падачы заяў -- не пазней І месяца з дня апублікавання паведамлення.

Заявы накіроўваць на адрас: 246699, г.Гомель, вул.Савецкая, 104.

**РЭКТАРАТ.**



**Степан СКОРИНА,**
**студент 2-го курса экономического факультэта**

**Знаёмства з гэтым юнаком, які зайшоў у рэдакцыю нашай газеты са сваімі вершамі, прынесла нам, можна сказаць, прыемнае адкрыццё. Па-першае, яго вершы спадабаліся, а па-другое, мы па-сапраўднаму здзівіліся прозвішчу Сцяпана — Скарына. Перапыталі, ці не псеўданім ён такі сабе ўзяў з прычыны захаплення паэзіяй. Аказалася, што не. Яно сапраўднае.**

**С.Скарына вучыцца на другім курсе эканамічнага факультэта і толькі на «выдатна». А захапленне паэзіяй прыйшло да яго тры гады назад. Ніколі раней свае вершы (а іх у яго даволі шмат) нідзе не друкаваў і вось разыкнуў паказаць іх у рэдакцыі універсітэцкай газеты. Некаторыя з іх, на наш погляд, больш удалыя, іншыя — менш, над імі яшчэ трэба папрацаваць.**

**Сёння мы прапануем вашай увазе тры вершы, а Сцяпану жадаем новых творчых удалых знаходак.**

### КНИГА СУДЕБ

*Мне жизнь писала эпилог,*
*Писала с самого рожденья,*
*Но до последнего мгновенья*
*Я прочитать его не смог.*
*Летели годы и мечты,*
*А жизнь писала и писала,*
*И рисовать не уставала*
*Меня на грани пустоты.*
*Я жил, надеясь и любя,*
*Она в лицо мое вгляделась*
*И изменить ей захотелось*
*Черты его, чуть огрубя.*
*Бровям придала седины,*
*Глазам суровость и бесцветность,*
*Чтоб перед шагом в неизвестность*
*Я старым был со стороны.*
*Но сердце, нет, не унывало.*
*Встав на последнюю ступень,*
*Я прежних дел увидел тень*
*И понял — сделано не мало.*
*А, может, просто старый льстец*
*Себя хочу я успокоить,*
*Но стоит ли об этом спорить...*
*Жизнь четко вывела «конец».*

### ДОРОГА

*Дорога, дорога, дорога,*
*Быть может, до самых небес*
*Меня от родного порога,*
*Петляя сквозь поле и лес,*
*Сквозь луч, через речку и села,*
*Проворно легко доведешь,*
*Быть может, веселой*
*Покажешься, доброй. Ну что ж,*
*Давно я уже собирался*
*Все дали с тобой покорить,*
*Давно к горизонту я рвался,*
*Хоть миг, но свободно пожить.*
*Но как-то все не получалось:*
*То занят работой я был,*
*То что-то другое случалось,*
*И не было времени, сил.*
*Но вот все оставлено разом,*
*Порвал бесконечный я круг*
*Знакомых, работы и сразу*
*Как-будто прошел вдруг недуг,*
*Вздохнулось легко и свободно.*
*Дорога, как ты хороша!*
*Навстречу зовущей природе*
*Несдержанно рвется душа.*

### ЗА ВЯСНОЙ

*Разнімае птушка крылы,*
*Каб пакінуць родны край...*
*Песня смутку ў небе мілым*
*Льецца быццам «выбачай».*
*Круг апошні над зямлёю,*
*Крык апошні над гняздом —*
*Разам з страчанай вясною*
*Апусцелы кінут дом...*
*Пацягнуліся ў вырай*
*Чарада за чарадой...*
*Восень. Холадна і сыра.*
*Ляцяць птушкі за вясной.*

# СПАРТЫЎНЫЯ НАВІНЫ

Пачалося новае алімпійскае чатырохгоддзе. Чарговыя XXVII Алімпійскія гульні адбудуцца ў аўстралійскім Сіднеі, і трэнеры будуюць свае планы праз іх прызму.

У Гродне прайшла міжнародная матчавая сустрэча па лёгкай атлетыцы паміж камандамі Польшчы, Украіны і Беларусі, у якой прымалі ўдзел спартсмены не старэй за 21 год. Студэнтка нашага універсітэта Наталля Салагуб упэўнена перамагла ў бегу на 100 і 200 м, а Валянцін Борсук быў трэцім на дыстанцыі 200 м.

У камандным заліку месцы размеркаваліся так: Польшча, Беларусь і Украіна.

***

У г.Мінску прайшоў чэмпіянат Беларусі па летняму шматбор"ю "Здароўе".

На вышэйшую прыступку п"едэстала гонару ўзняліся студэнтка факультэта фізічнай культуры Наталля Соцкая, студэнт геолага-геаграфічнага факультэта Вячаслаў Старацітараў, выкладчыца кафедры фізвыхавання Галіна Галаўнёва.

У камандным заліку Гомельшчына на трэцім месцы, уступіўшы Магілёўскай вобласці і г.Мінску.

***

З сярэбранымі ўзнагародамі чэмпіянату свету па скачках на батуце вярнулася з канадскага горада Ванкувера студэнтка 4-га курса факультэта фізічнай культуры Людміла Падасенка. Яна заваявала гэтую ўзнагароду ў парных скачках, а Руслан Кашперка -- у індывідуальных.

Нашых студэнтаў трэніруе заслужаны трэнер Беларусі Аляксандр Пастэрнак.

**В.МАРЧАНКА.**

## Інфармуе служба"01" Каб пазбегнуць трагедыі

Сухое, спякотнае летняе надвор'е змянілася асеннімі дажджамі і начнымі замаразкамі. Сезоннае пахаладанне вымушае жыхароў сяла затапліваць печы. Горш даводзіцца гараджанам. Ацяпляльны сезон яшчэ не пачаўся, таму асобныя грамадзяне, каб сагрэцца, уключаюць у сваіх кватэрах, у пакоях інтэрнатаў розныя электранагравальныя прыборы, у асноўным з адкрытай спіраллю, часам нават кустарнага вырабу. Любы з гэтых электрапрыбораў, за выключэннем масляных радыятараў, уяўляе сур'ёзную пажарную небяспеку, калі не захоўваць правілаў карыстання імі.

Толькі ў бягучым годзе ў інтэрнатах Гомельшчыны па прычыне ўзгарання электранагравальных прыбораў адбыліся 4 пажары, у час якіх адзін чалавек загінуў і адзін атрымаў апёкі.

Пажарная ахова зноў папярэджвае домаўладальнікаў, кватэраздымшчыкаў, студэнтаў: з наступленнем асенне-зімовага ацяпляльнага сезона карыстайцеся электрапрыборамі толькі па іх прамому прызначэнню. Яны павінны быць толькі заводскага вырабу. У месцах масавага пражывання людзей не дапускаецца выкарыстанне розных электрапрыбораў з адкрытай спіраллю.

Памятайце! Пакінуты без нагляду ўключаны электрапрыбор у доме, кватэры, пакоі інтэрната можа стаць прычынай вялікай трагедыі.

**Л.КОШЭЛЬ, інспектар ВПЧ-І Цэнтральнага раёна г.Гомеля.**



## КУЗНЯЦОЎ Георгій Аляксеевіч

На 72-м годзе жыцця перастала біцца сэрца доктара геолага-мінералагічных навук, прафесара Георгія Аляксеевіча Кузняцова.

Г.А.Кузняцоў нарадзіўся ў г.Срэценску Чыцінскай вобласці ў сям"і рабочага. У 1942 г. паступіў на геалагічны факультэт Іркуцкага дзяржуніверсітэта, праз год быў прызваны ў Чырвоную Армію. Удзельнічаў у вайне з Японіяй у складзе Забайкальскага фронту. Пасля дэмабілізацыі вярнуўся на геалагічны факультэт Іркуцкага універсітэта. Будучы студэнтам, кіраваў пошукамі карысных выкапняў на пасадзе начальніка партый і атрадаў. Выкладаў ва універсітэце, абараніў кандыдацкую і доктарскую дысертацыі. У 60-х гадах быў загадчыкам кафедры і дэканам геафака ў Іркуцкім універсітэце.

З 1973 г. прафесар Г.А.Кузняцоў працаваў у нашым універсітэце. Ён распрацаваў і чытаў курсы па агульнай геалогіі, гістарычнай геалогіі і палеанталогіі, рэгіянальнай геалогіі, гісторыі і метадалогіі геалагічных навук, кіраваў вучэбнай практыкай. У сваіх лекцыях і на геалагічных маршрутах прафесар Г.А.Кузняцоў шмат увагі ўдзяляў экалагічнаму выхаванню будучых маладых геолагаў.

Г.А.Кузняцоў кіраваў метадычнай камісіяй геолага-геаграфічнага факультэта, з"яўляўся членам міжведамаснага навуковага Савета па праблемах Палесся, членам Сусветнага Саюза гісторыкаў і філосафаў прыродазнаўства СНД.

Георгій Аляксеевіч карыстаўся вялікай павагай сярод калег і студэнтаў.

Светлая памяць аб Г.А.Кузняцову назаўсёды захаваецца ў нашых сэрцах.

**Група таварышаў.**

Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, увесь калектыў геолага-геаграфічнага факультэта глыбока смуткуюць з выпадку смерці доктара геолага-мінералагічных навук, прафесара **КУЗНЯЦОВА Георгія Аляксеевіча** і выказваюць сваё спачуванне яго сям'і і родным.

Рэктарат, грамадскія арганізацыі, увесь калектыў універсітэта выказваюць глыбокае спачуванне дацэнту кафедры эканомікі і кіравання вытворчасцю **СЕЛЬКІНАЙ Людміле Антонаўне** і першаму прарэктару прафесару **СЕЛЬКІНУ Міхаілу Васільевічу** з выпадку напаткаўшага іх гора -- смерці **МАЦІ і ЦЕШЧЫ**.

Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, увесь калектыў геолага-геаграфічнага факультэта выказваюць глыбокае спачуванне дэкану прафесару **ПІНЧУКУ Адаму Пятровічу** з выпадку напаткаўшага яго гора -- смерці **БАЦЬКІ**.

Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, калектыў музея-лабараторыі Ф.Скарыны выказваюць глыбокае спачуванне загадчыку музея **УСОВІЧУ Канстанціну Сяргеевічу** з выпадку напаткаўшага яго гора -- смерці **БАЦЬКІ**.

Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытат, эканамічных даных, асабістых імён, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытый публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не раздзяляючы пункту гледжання аўтара.

ЗАСНАВАЛЬНІК -- Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф.Скарыны.

Наш адрас: 246699, г. Гомель, вул. Савецкая, 104, пакой 1-18, тэл. 57-43-21.
Рэгістрацыйны № 221

Спонсар газеты -- прафком студэнтаў.

Газета набрана і зверстана на настольна-выдавецкім комплексе ІВЦ ГДУ, аддрукавана на фабрыцы "Палесдрук", г.Гомель, вул. Савецкая, 1.

Рэдактар Ул.П. БАЛОГА

Аб'ём 1 друк. арк.
Тыраж 1.000 экз.
Заказ 509
Падпісана да друку 3.10.96.